*Е. У. Міхайлава (Мінск),*
*саіскальнік кафедры бібліятэказнаўства Беларускага Дзяржаўнага універсітэта культуры*

# БІБЛІЯТЭКА І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА СТУДЭНТАЎ

## *(на вопыце бібліятэкі Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута)*

Падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай адукацыі на сучасным этапе ў значнай ступені залежыць ад дзейнасці бібліятэкі, ад якаснага фарміравання і выкарыстання яе інфармацыйных рэсурсаў. Менавіта яны заклікаany садзейнічаць станаўленню інфармацыйнай культуры студэнтаў, гэта значыць уменню мэтанакіравана працаваць з інфармацыяй і выкарыстоўваць для яе атрымання, апрацоўкі і перадачы інфармацыйныя тэхналогіі. Для свабоднай арыентацыі ў інфармацыйных патоках студэнт павінен валодаць інфармацыйнай культурай як адной з асноўных частак агульнай культуры.

Як вядома, тэрмін "інфармацыйная культура" трактуецца вучонымі ў розных накірунках: разглядаюцца яе гуманітарныя аспекты, прававое рэгуляванне, сацыяльныя, філасофскія, псіхілагічныя, адукацыйныя, маральна-этычныя аспекты.

У суадносінах з бібліятэчнай працай нам найбольш імпануе вызначэнне інфармацыйнай культуры, якое прапанаваў прафесар В. Е. Лявончык. У шматлікіх артыкулах ён сфармуляваў інфармацыйныя патрэбы асобы, вызначыў шляхі пошуку метадалогіі, разгледзеў рэгіянальны аспект, вылучыў культуралагічныя праблемы. Зыходзячы з яго тэорыі, мы можам вызначыць задачы, якія заклікана вырашаць бібліятэка Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. На наш погляд, яны наступныя:

– садзейнічаць фарміраванню статуса асобы студэнта — будучага ўрача, яго каштоўнасных арыентацый, матываў, інакш кажучы, сацыяльнай культуры;

– спрыяць развіццю і ўдасканаленню інтэлектуальнай, эстэтычнай, маральнай, валявой культуры, культуры светапогляду і пачуццяў, гэта значыць духоўнай культуры;

– садзейнічаць фарміраванню, развіццю і праяўленню інтэлектуальных здольнасцей;

– спрыяць развіццю высокай візуальнай культуры.

Каб станоўча вырашыць гэтыя задачы, неабходна цесная сувязь бібліятэкараў з інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі ВНУ. Сувязь гэта праяўляецца, на наш погляд, у такіх відах дзейнасці бібліятэкара, як збор інфармацыі, яе аналітыка-сінтэтычная апрацоўка, абслугоўванне карыстальнікаў.

Галоўную ролю ў вышэйшай адукацыі адыгрывае якасць доступу да інфармацыі. Кожнаму студэнту неабходны мінімум навыкаў выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій. Нездарма стратэгічнай мэтай развіцця Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута з'яўляецца інфарматызацыя навучальнага працэсу, развіццё здольнасцей выпускніка інстытута да дзейнасці ў інфармацыйным грамадстве. Дасягнуць гэтай мэты дапамагае паступовае развіццё камп'ютэрызацыі бібліятэчнага абслугоўвання, стварэнне баз даных па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобных накірунках, а ў перспектыве — стварэнне камп'ютэрнага класа Internet.

Бібліятэка Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута валодае вялікім інфармацыйным патэнцыялам, які у сучасны момант не цалкам выкарыстоўваецца спажыўцамі.

Напрыклад, вялікае значэнне маюць навуковыя, навучальныя, навукова-метадычныя працы прафесарска-выкладчыцкага складу інстытута. Вучонымі за 11 год існавання інстытута апублікавана звыш 40 манаграфій, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 557 артыкулаў у навуковых часопісах. Гэты навуковы арсенал здольны аказаць вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы спецыялістаў медыцынскіх спецыялізацый не толькі нашай ВНУ, але і іншых медыцынскіх устаноў Рэспублікі Беларусь. Але, на вялікі жаль, без наяўнасці Internet гэтыя інфармацыйныя рэсурсы выкарыстоўваюцца недастаткова.

У развіцці інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута можна вылучыць яшчэ адну праблему: фонды бібліятэкі, у асноўным, уяўляюць сабой друкаваныя крыніцы на традыцыйных носьбітах інфармацыі, што складае пэўныя цяжкасці ў іх размяшчэнні. У той жа час існаванне на інфармацыйным рынку новых відаў дакументаў (кампакт-дыскаў, аўдыё- і відэадакументаў і інш.) дае магчымасць для іх набыцця і ўключэння ў фонд бібліятэкі. Мяркуецца, што з павелічэннем гэтых фондаў і адпаведнага попыту на іх бібліятэка зможа часткова змяніць традыцыйную структуру, вылучыць у бібліятэчным абслугоўванні спецыялізаванае падраздзяленне. Ужо зараз перад інстытутам паўстала праблема аб стварэнні электронных дакументаў і далейшай камп'ютэрызацыі бібліятэкі.

У замежных краінах, якія знаходзяцца ў стадыі пераходу да інфарматызацыі грамадства, ствараюцца электронныя бібліятэкі. Калі б такая бібліятэка была ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце, гэта дазволіла б павысіць інфармацыйную культуру студэнтаў.

Па-першае, былі б створаны гіпертэкставая база даных, мультымедэйныя падручнікі, дапаможнікі, электронныя версіі навуковых работ.

Па-другое, карыстацца такой бібліятэкай студэнты змаглі б у лабараторыях і кабінетах інстытута праз персанальныя камп'ютэры, а таксама праз дамашнія персанальныя камп'ютэры.

Па-трэцяе, пры стварэнні электроннай бібліятэкі карыстальнікі змогуць праз сервер бібліятэкі атрымліваць доступ да інфармацыйных рэсурсаў трох іншых медыцынскіх ВНУ Беларусі (Мінскага, Віцебскага і Гродзенскага), а таксама бібліятэчна-інфармацыйных устаноў замежных краін.

Гэта дазволіць зэканоміць фінансавыя сродкі, бо стварэнне, набыццё і захаванне электронных дакументаў значна танней, чым на традыцыйных носьбітах інфармацыі.

Такім чынам, менавіта ўкараненне сучасных камп'ютэрных і сацыяльных тэхналогій дасць магчымасць фарміраваць на самым высокім узроўні інфармацыйную культуру студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ